войска ўзбройвалася сякерамі, нават у XII–XIII стст. працягвалася ўжыванне касцяных гірак кісцянёў, простых лукаў, а таксама паліц, якія складаліся з аднаго суцэльнага драўлянага масіву з патоўшчаннем на другім канцы ад дзяржала.

Робячы вынік можна сказаць, што ўзбраенне на беларускіх княствах прайшло ў сваім развіцці складаны шлях супрацьстаяння засцерагальнай і наступальнай зброі, на якім яно ўбірала ў сабе лепшыя ўзоры суседзяў, удасканальвалася і ўскладнялася, дазваляючы мясцоваму насельніцтву нароўных падтрымліваць адносіны з іншымі дзяржавамі.

**Літаратура**


1. *Кирпичников А. Н.* Древнерусское оружие: Вып. 1. Мечи и сабли IX–XIII вв. / А.Н. Кирпичников. – АН СССР. ИА. – М.; Л.: Наука, 1966. – 176 с.; ил.
2. *Кирпичников А. Н.* Древнерусское оружие: Вып. 2. Копья, сулицы, боевые топоры, булавы, кистени IX–XIII вв. / А.Н. Кирпичников. – АН СССР. ИА. – М.; Л.: Наука, 1966. – 147 с.; ил.
3. *Кирпичников А. Н.* Древнерусское оружие: Вып. 3. Доспех, комплекс боевых средств IX–XIII вв. / А.Н. Кирпичников. – АН СССР. ИА. – Л.: Наука, 1971. – 92 с.; ил.
4. *Колединский Л. В.* Находка лука из раскопок Верхнего замка Витебска / Л.В. Колединский // ГАЗ. – Мн.: Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 1995. – № 6. – С. 198 – 201.
5. *Лупиненко, Ю. М.* Чешуйчатый доспех восточнославянского ратника XII-XIII вв. / Лупиненко, Ю.М., Макушников О.А. // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мн.: Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 2008. – вып.15. – С. 140-154.
6. *Медведев А. Ф.* Ручное метательное оружие. Луки и стрелы, самострелы. / А.Ф. Медведев. – М.: Наука, 1966. – 128 с.; ил.
7. *Плавінскі, М. А.* Узбраенне беларускіх земляў X–XIII стагоддзяў / М.А. Плавінскі. – Мінск: Галіяфы, 2013. – 106 с.: іл.


# ДЭМАКРАТЫЗАЦЫЯ ВОЙСКАЎ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ Ў САКАВІКУ – КАСТРЫЧНІКУ 1917 г.


**Я. А. Бодрыкаў**


Лютаўская рэвалюцыя ў Расійскай імперыі 1917 г. вельмі сур’ёзна закранула Рускую імператарскую армію, знайшоўшы свой водгук і на Заходнім фронце, войскі якога размяшчаліся на тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь. Армія адыграла значную ролю падчас падзей Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. і стала важным фактарам у палітычным жыцці ўсёй Расійскай імперыі. У той жа час, відавочным было ўзмацненне уплыву палітычных падзей на салдатаў і афіцэраў, што прывяло да працэсаў дэмакратызацыі войскаў, якая ў асноўным праяўлялася

ў скасаванні прынцыпу армейскага адзінаначалля, стварэнні салдацкіх і афіцэрскіх камітэтаў, увядзенні грамадзянскіх правоў для салдат і інш.

Працэсам дэмакратызацыі падверглася ўся армія, але кожны фронт меў асаблівую спецыфіку і дынаміку развіцця падзей. Заходні фронт па свайму стратэгічнаму месцазнаходжанню займаў важнае месца як у планах радыкальных рэвалюцыйных дзеячаў, так і ў планах армейскага камандавання. У той жа час на абшарах усёй Расійскай імперыі ўзмацніліся нацыянальныя рухі, якія імкнуліся выкарыстаць вайсковы патэнцыял шматнацыянальнай арміі. Усе азначаныя палітычныя сілы мелі розныя мэты і сродкі іх ажыццяўлення, але ў сваёй палітыцы закраналі дзейнасць Заходняга фронту, уплываючы на працэсы ўнутры яго. Дэмакратызацыя войскаў Заходняга фронту ў перыяд паміж Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыямі 1917 г. паўплывала не толькі на далейшае сацыяльна-палітычнае развіццё беларускіх зямель і Расійскай дзяржавы ўвогуле, але і на ход усей Першай сусветнай вайны.

Тэма дэмакратызацыі войскаў Заходняга фронту ў сакавіку – кастрычніку 1917 г. доўгі час заставалася без належнага разгляду. Айчынная гістарыяграфія савецкага перыяду толькі часткова разглядала дадзенае пытанне, акцэнтуючы ўвагу на дзейнасці партыі бальшавікоў у азначаны перыяд. Выключэнне з гэтай тэндэнцыі можна лічыць працу М.М. Смальянінава [7]. Пасля 1991 г. сярод беларускіх гісторыкаў пашырылася распрацоўка недаследаваных пытанняў Першай сусветнай вайны. Сярод апошніх работ, якія закранаюць дадзенае пытанне, можна адзначыць кнігі В.М. Бялявінай [1] і М.М. Смальянінава [6]. Сярод замежных даследаванняў па дадзенаму пытанню можна адзначыць кнігу А. Латышонка [5], якая часткова закранае дадзеную тэму, а таксама зборнік дакументаў па дадзенаму пытанню У.Л. Ганчарова. Трэба адзначыць, што ні адна з азначаных работ не раскрывае тэмы цалкам, закранаючы ў асноўным толькі асобныя аспекты дадзенага пытання. Таму, даследаванне дэмакратызацыі войскаў Заходняга фронту ў сакавіку – кастрычніку 1917 г. застаецца актуальнай тэмай.

Лютаўскую рэвалюцыю 1917 г. войскі Заходняга фронту сустрэлі ў стане недахопу харчавання. Галоўнакамандуючы Заходнім фронтам генерал А.Е. Эверт (1857–1926) яшчэ напярэдадні рэвалюцыі падкрэсліваў вастрыню і небяспечнасць харчовага пытання ў арміях Заходняга фронту, але праблему камандаванне своечасова вырашыць не здолела [6, с. 214–215]. Пашырыліся рэвалюцыйныя настроі ў войсках, якія жорстка крытыкавалі армейскае камандаванне і палітыку царызму ўвогуле. Гэтаму спрыялі непасьпяховыя наступленні армій Заходняга фронту ў 1916 г., вялікія страты сярод перадавых частак і як след папаўненне гэтых падраздзяленняў за кошт нядобранадзейных з афіцыйнага пункту глед-

жання элементаў. Усё гэта выклікала расчараванне ў вайне і ўзмацняла недавер да ўладаў.

Падчас рэвалюцыйных падзей у Петраградзе ў лютым – сакавіку 1917 г. імператар Мікалай ІІ (1894–1917) спрабаваў выкарыстаць армію, накіраваўшы на мяцежны Петраград карную экспедыцыю генерала М.І. Іванава, у атрад якога ўваходзіла і некалькі палкоў з Заходняга фронту. Але, гэты атрад да сталіцы так і не дайшоў. Іншых значных выступленняў у абарону царскай улады на Заходнім фронце зафіксавана не было. Такім чынам, аналізуючы стан войскаў у першыя дні сакавіка 1917 г., можна казаць, што армія ў абсалютнай большасці сваёй прызнала і падтрымала рэвалюцыю [2, с. 464].

1(14) сакавіка 1917 г. ад імя Петраградскага савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў з'явіўся «Загад №1» для гарнізона Петраградскай акругі, згодна якому ва ўсіх вайсковых частках ствараліся выбарныя камітэты, якія ажыццяўлялі кіраўніцтва сваімі часткамі. Камітэты непасрэдна падпарадкоўваліся савету рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Забаранялася выдаваць афіцэрам любую зброю, якая з гэтага моманту знаходзілася пад кантролем камітэтаў. Па-за службай і строем для салдатаў фактычна скасоўвалася армейская дысцыпліна, забараняліся грубыя адносіны да ніжэйшых чыноў, зварот на «ты», у той жа час зварот да афіцэраў павінен быў ажыццяўляцца па спрошчанай форме: «спадар генерал», «спадар палкоўнік», «спадар капітан» і г.д. Загад павінен быў распаўсюджвацца толькі на войскі Петраградскай акругі, але рознымі сродкамі трапляў да франтавых частак, на баяздольнасць якіх аказваў разбуральны ўплыў. Загад №1 фактычна парушаў прынцып армейскага адзінаначалля, што было вельмі небяспечна для арміі і фронту ва ўмовах вайны. Загад №1 стаў пачаткам новай глыбокай дыферэнцыяцыі войскаў на салдацкую большасць і афіцэрскую меншасць. Першыя былі большымі па колькасці і больш радыкальнымі па поглядах, другія значна саступалі ў колькасці, але яшчэ захоўвалі пэўны ўплыў на салдацкія масы і мелі менш рэвалюцыйныя погляды [4].

Заканчэнне рэвалюцыйных падзей у краіне не скончыла пераўтварэнні ў арміі. У сакавіку – красавіку 1917 г. з формы былі выдалены манархічныя знакі адрознення, а сама Руская імператарская армія была перайменаваная ў Рэвалюцыйную армію свабоднай Расіі. Паступова з арміі выдаляліся генералы і афіцэры манархічных поглядаў. У першую чаргу гэта кранула камандаванне Заходняга фронту. 11(24) сакавіка 1917 г. з пасады камандуючага Заходнім фронтам быў зняты А.Е. Эверт. Генерал не рабіў спроб дапамагчы Мікалаю ІІ падавіць беспарадкі ці вярнуць прастол пасля яго адрачэння, але былі шырока вядомыя яго сімпатыі да звергнутага імператара. Разам з А.Е. Эвертам яшчэ некалькі

генералаў Заходняга фронту былі пазбаўленыя сваіх пасад і неўзабаве ўвогуле звольненыя з арміі. Гэты працэс атрымаў назву «рэвалюцыйная чыстка генералітэту» або «гучкоўская чыстка» (ад прозвішча ваеннага міністра А.І. Гучкова).

Новым часовым галоўнакамандуючым Заходнім фронтам быў прызначаны генерал У.В. Смірноў, які кіраваў фронтам некалькі дзён, пасля чаго быў зноў пераведзены на новую пасаду ў Петраград. 31 сакавіка (13 красавіка) 1917 г. галоўнакамандуючым Заходнім фронтам быў прызначаны генерал В.І. Гурко, але і ён не здолеў на доўгі час затрымацца на гэтай пасадзе. Змены камандавання праводзіліся і на ніжэйшых узроўнях: у арміях, карпусах і дывізіях. Нестабільнасць у генеральскіх шэрагах адмоўна ўплывала на дысцыпліну ў войсках, аўтарытэт генералітэту і афіцэрства ўвогуле ў арміі падаў [3, с. 83–86].

Ва ўмовах двоеўладдзя, якое панавала ў краіне, знешнія сілы таксама імкнуліся з першых паслярэвалюцыйных дзён узварушыць салдацкія масы. У надзеі знайсці новых узброеных саюзнікаў ў сакавіку 1917 г. на Заходні фронт прыязджалі меншавіцкія, эсэраўскія і бальшавіцкія агітатары [7, с. 21]. Бальшавікі актыўна агітавалі салдат да сканчэння вайны і заключэння справядлівага міру, але пазіцыі партыі ў сакавіку 1917 г. былі яшчэ вельмі хісткія. У першыя тыдні пасля Лютаўскай рэвалюцыі сярод салдат Заходняга фронту панаваў лозунг: «Вайна ў абарону свабоды і рэвалюцыі». Пры гэтым, да актыўных наступальных дзеянняў салдаты ўжо не імкнуліся. Трэба адзначыць, што агітацыя дзеячамі розных палітычных сіл на Заходнім фронце працягвалася да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г.

Генералітэт і афіцэры Заходняга фронту спрабавалі не дапусціць паглыблення рэвалюцыйных настрояў у сваіх частках. Агітатары ад розных левых палітычных партый перыядычна затрымліваліся па дарозе да салдатаў, а замест іх афіцэры прапаноўвалі заклікаць на фронт прадстаўнікоў Часовага ўрада. Аналізуючы прычыны такой пазіцыі афіцэрства трэба адзначыць, што на той момант у Часовым урадзе абсалютную большасць складалі прадстаўнікі правых партый, якія не прытрымліваліся радыкальных палітычных поглядаў. У той жа час вярхоўнае камандаванне спрабавала абмежаваць функцыі салдацкіх камітэтаў пытаннямі быту і гаспадаркі. У камітэты ад камандавання дасылаліся афіцэры. Месцамі такая палітыка мела поспех [6, с. 218–220].

Паралельна са стварэннем салдацкіх камітэтаў афіцэрамі ствараліся ўласныя арганізацыі, афіцыйная мэта ў якіх была «абслугоўванне інтарэсаў прафесійных вайскоўцаў». Фактычна гэта азначала спробу кансалідацыі афіцэрства перад небяспекай з боку рэвалюцыйных салдатаў. Першай такой арганізацыяй стала «Ваенная Ліга», створаная ў сакавіку

1917 г. У маі 1917 г. пад кіраўніцтвам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага быў створаны Саюз афіцэраў арміі і флоту. Афіцэрскія арганізацыі былі агульнарасійскія па свайму характару, але мелі свае філіялы ў вайсковых частках Заходняга фронту. Трэба адзначыць, што дзейнасць «Ваеннай лігі» і «Саюза афіцэраў арміі і флоту» не прывялі да ўмацавання пазіцыі афіцэрства: па-ранейшаму, перыядычна афіцэры абяззбройваліся, а некаторыя ўвогуле цярпелі фізічны гвалт ад сваіх салдатаў.

У красавіку 1917 г. міністр замежных спраў Расіі П.М. Мілюкоў адправіў тэлеграму прадстаўнікам краін Антанты, у якой казалася, што Расійская імперыя будзе прымаць удзел у вайне да канчатковай перамогі. Змест тэлеграмы стаў вядомы расійскай грамадскасці, што выклікала першы крызіс Часовага ўрада, які прама закрануў армію. У войсках Заходняга фронту адбыліся салдацкія дэманстрацыі, якія ўпершыню насілі яскравы антываенны характар і праводзіліся пад лозунгамі «Вайна вайне!» і «Далоў Часовы ўрад і Мілюкова!». Галоўнакамандуючы заходнім фронтам В.І. Гурко прымаў надзвычайныя меры для ўсталявання парадку ў войсках, але дэманстрацыі скончыліся толькі пасля адстаўкі міністраў А.І. Гучкова і П.М. Мілюкова і тлумачэння прадстаўнікамі Часовага ўрада асобных пунктаў скандальнай тэлеграмы [6, с. 218–220].

Яшчэ адной падзеяй красавіка 1917 г., якая аказала ўплыў на войскі, стала вяртанне з-за мяжы шэрагу бальшавікоў на чале з В.І. Леніным (1870–1924). Красавіцкія тэзісы, якія выдаў лідар бальшавікоў пасля вяртання ў Расію, падштурхнулі бальшавікоў да пашырэння антываеннай агітацыі сярод салдатаў Заходняга фронту, што адмоўна сказалася на дысцыпліне і баявым духу войскаў.

Антываенная агітацыя і весткі пра перадзел зямлі падштурхнулі многіх салдат, значная колькасць з якіх да вайны былі вясковымі жыхарамі, да дэзерцірства са сваіх вайсковых частак. Трывожных памераў гэта з’ява дасягнула ўжо ў красавіку – маі 1917 г., калі многія ўзброеныя дэзерціры вярталіся ў свае вёскі і ініцыявалі незаконны перадзел зямлі на сваю карысць. Спробы галоўнакамандуючага Заходнім фронтам В.І. Гурко і яго наступнікаў спыніць працэсы дэзерцірства на фронце пацярпелі паразу.

У маі 1917 г. была апублікаваная «Дэкларацыя правоў салдат», якая фактычна прыраўняла ў правах салдатаў з грамадзянскім насельніцтвам. Галоўнакамандуючы Заходнім фронтам В.І. Гурко рэзка раскрытыкаваў новы дакумент, за што быў зняты са сваёй пасады. Новым галоўнакамандуючым Заходнім фронтам быў прызначаны генерал А.І. Дзянікін. У гэты ж час новым Вярхоўным Галоўнакамандуючым замест генерала М.В. Аляксеева быў прызначаны А.А. Брусілаў. Новае камандаванне

павінна было вырашыць складаную задачу: падрыхтаваць войскі да запланаванага яшчэ да Лютаўскай рэвалюцыі летняга наступлення, не згортваючы дэмакратызацыю ў войсках.

Рэакцыяй з верху на працэсы паступовага разлажэння арміі стала фармаванне на Заходнім фронце «рэвалюцыйных частак» (па-другому іх называлі «ударнымі», «штурмавымі» або «часткамі смерці»). Першыя ўдарныя часткі былі сфармаваныя яшчэ ў маі 1917 г. З чэрвеня 1917 г. генерал А.А. Брусілаў ініцыяваў стварэнне «руху смерці», які аб'ядноўваў у сябе ўдарныя часткі. У рамках гэтага руху быў створаны жаночы батальён смерці пад кіраўніцтвам М.Л. Бачкаровай, які быў накіраваны на Заходні фронт. Таксама ствараліся батальёны георгіеўскіх кавалераў. Такія падраздзяленні адрозніваліся жорсткай дысцыплінай і высокай баяздольнасцю, таму павінны былі стаць асноўным інструментам расійскага камандавання ў новым летнім наступленні. Пры гэтым, салдаты звычайных армейскіх частак адмоўна ставіліся да «частак смерці», асабліва гэта тычылася жаночага батальёну смерці, які салдаты першапачаткова ўспрынялі як франтавых жанчын лёгкіх паводзін.

У ліпені 1917 г. сіламі розных франтоў пачалося наступленне на нямецкія і аўстра-венгерскія пазіцыі. На войскі Заходняга фронту ўскладалася задача прарыву нямецкай лініі ўмацаванняў і далейшае наступленне на Вільну. Асноўны ўдар павінна была наносіць 10-я армія, але з 14 дывізій яе складу ў бой пайшлі толькі 7. У баях лета 1917 г. на Заходнім фронце асабліва адзначыліся «часткі смерці», сярод якіх быў і жаночы батальён М.Л. Бачкаровай. Але, аперацыя не прынесла станоўчых вынікаў для рускага камандавання: войскі не здолелі прарваць нямецкую абарону і значна прасунуцца ў бок Вільні, пры гэтым баяздольныя часткі панеслі вялікія страты. Летняе наступленне 1917 г. канчаткова падарвала маральна-баявы дух войскаў Заходняга фронту і спрыяла значнаму пашырэнню антываенных настрояў у армейскіх падраздзяленнях [1, с. 43–44].

Няўдалае наступленне пацягнула за сабой чарговыя кадравыя перастаноўкі. Замест А.І. Дзянікіна выконваючым абавязкі галоўнакамандуючага Заходнім фронтам быў прызначаны генерал П.М. Ламноўскі, але праз некалькі дзён на гэтай пасадзе яго замяніў генерал П.С. Балуеў. Новым Вярхоўным Галоўнакамандуючым быў прызначаны генерал Л.Г. Карнілаў.

У адрозненні ад свайго папярэдніка генерала А.А. Брусілава, генерал Л.Г. Карнілаў не жадаў слухацца парадаў салдацкіх камітэтаў, а імкнуўся аднавіць дысцыпліну ў войску і ўвогуле хацеў «навесці парадак» у краіне. З гэтай мэтай ён прапанаваў кіраўніку Часовага ўрада А.Ф. Керанскаму шэраг мер, сярод якіх было патрабаванне вяртання

смяротнага пакарання на фронце. Жорсткімі мерамі генерал здолеў часткова аднавіць парадак на франтах і спыніць хвалю дэзерцірства ў арміі. Рашучыя і моцныя захады Л.Г. Карнілава знайшлі падтрымку як у афіцэрскім асяродку, так і ў частцы палітычных дзеячаў. Генерал стаў верагодным прэтэндэнтам на ўладу, бо абяцаў рашуча бароцца з рэвалюцыйнай анархіяй і безуладдзем у краіне. Гэта выклікала моцную незадаволенасць А.Ф. Керанскага. Негалосны канфлікт перарос Карнілаўскае выступленне ці Карнілаўскі мяцеж.

Для падаўлення Карнілаўскага выступлення А.Ф. Керанскі вымушаны быў пайсці на зближэнне з левымі сіламі. Фактычна з падполля выйшлі бальшавікі, якія аказалі дзейсную дапамогу ў падрыхтоўцы абароны Петраграда і раззбраенні карнілаўскіх частак. Прымалі ўдзел у раззбраенні карнілаўцаў і салдаты Заходняга фронту, якія не жадалі ўсталявання ў краіне рэакцыйнай антырэвалюцыйнай дыктатуры. Мяцеж Л.Г. Карнілава хутка быў падаўлены, сам генерал і яго паплечнікі былі арыштаваныя. Але, галоўным наступствам няўдалага мяцяжу стала палявенне настрояў у ва ўсім грамадстве, а асабліва ў войсках Заходняга фронту. Правыя сілы дыскрэдытавалі сябе супрацоўніцтвам з карнілаўцамі ці сімпатыямі да мяцяжу, у той жа час у лагеры левых сіл заметную ролю пачалі адыгрываць бальшавікі, якія імкнуліся скончыць вайну і канчаткова дэмакратызаваць армію [1, с. 45].

Адным з працэсаў, характэрных для ўсёй арміі ў 1917 г. з'яўляецца стварэнне нацыянальных частак. Першыя такія падраздзяленні былі створаныя ў царскай арміі яшчэ да Лютаўскай рэвалюцыі, але падзеі 1917 г. выклікалі хвалю нацыянальнага адраджэння розных народаў на ўсёй тэрыторыі Расійскай імперыі, што істотна закранула і армію. Частка генералітэту пабачыла ў нацыянальных частках саюзнікаў для барацьбы з дэмакратызацыяй арміі, бо нацыянальныя часткі лічыліся больш дысцыплінаванымі і баяздольнымі. Але, стварэнне вялікай колькасці розных нацыянальных частак пагражала развалам адной шматнацыянальнай арміі на некалькі нацыянальных армій, таму нацыянальныя часткі ствараліся ў першую чаргу для палякаў, украінцаў, латышоў, палонных чэхаславакаў і мусульманскіх народаў Расіі. На Заходнім фронце летам 1917 г. пачалося стварэнне 1-га Польскага корпусу на чале з генералам Ю. Доўбар-Мусніцкім. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. корпус не быў сфармаваны канчаткова, таму ў гэты перыяд удзелу ў баявых дзеяннях не прымаў [5, с. 42–44].

Дзеячамі беларускага нацыянальнага руху таксама прадпрымаліся спробы пашырэння свайго ўплыву на армейскія часткі. Для гэтага ў маі 1917 г. у Мінску нелегальна была створана Беларуская Вайсковая арганізацыя (БВА). Вайскоўцамі-беларусамі С. Рак-Міхайлоўскім, І. Дварча-

нінам, В. Адамовічам і інш. на заходнім фронце праводзілася агітацыя сярод салдат-беларусаў, але да стварэння беларускіх частак у гэты перыяд справа не дайшла. У кастрычніку – лістападзе 1917 г. адбыўся афіцыйна дазволены Вярхоўным Галоўнакамандуючым генералам М.М. Духоніным з'езд беларусаў-вайскоўцаў Заходняга фронту, на якім БВА была пераўтвораная ў Беларускую цэнтральную вайсковую раду (БЦВР) [5, с. 44].

Восенню 1917 г. дэмакратызацыя войскаў Заходняга фронту ўступіла ў свой заключны этап. Барацьба з дэзерцірствам, пачатая генералам Л.Г. Карнілавым, пасля мяцяжу фактычна скончылася, узрос недавер і непрыязь салдатаў да афіцэраў, што вылілася павелічэнні выпадкаў забойстваў афіцэраў. Пашырылася і такая з'ява, як братання. Салдаты варожых армій сустракаліся не нейтральнай паласе, распівалі спіртныя напоі і вялі гандаль. Па сведчанням відавочца тых падзей Ф. Рушчыца, рускія салдаты за бутэльку гарэлкі прадавалі немцам баявы кулямёт. Пры гэтым, нямецкія салдаты «браталіся» толькі з дазволу сваіх афіцэраў, у той жа час як рускія салдаты арыштоўвалі ці забівалі сваіх камандзіраў, калі тыя перашкаджалі ім [1, с. 45].

Паступова адбывалася бальшавізацыя салдацкіх камітэтаў. Асабліва гэты працэс узмацніўся пасля, Карнілаўскага мяцяжу, калі бальшавіцкая партыя выйшла з падполля і значна пашырыла свой уплыў на салдацкія масы. У салдацкіх камітэтах бальшавікі прапагандавалі салдат да скончэння вайны са знешнім ворагам, пры гэтым працягваючы барацьбу за ўладу ўнутры краіны. Нелегальная літаратура і агітацыі бальшавікоў спрыялі канчатковай дэмакратызацыі арміі, таму падчас Кастрычніцкай рэвалюцыі войскі ўжо не маглі супраціўляцца захопу ўлады бальшавікамі [6, с. 236].

Падсумоўваючы, трэба адзначыць, што пачатак дэмакратызацыі арміі быў закладзены яшчэ падчас Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. выданнем «Загада №1». Пры гэтым, войскі Заходняга фронту спрыяльна ўспрынялі гэту рэвалюцыю і ўсталяванне ў краіне новай улады. Пасля заканчэння рэвалюцыі працэсы дэмакратызацыі ў Заходнім фронце працягнуліся. Камандаванне спрабавала спыніць разлажэнне арміі стварэннем «ударных» і нацыянальных частак, але пасля правалу летняга наступлення 1917 г. маральна-баявы дух войскаў фронту быў канчаткова падарваны, значна пашырыліся антываенныя настроі. Генерал Л.Г. Карнілаў жорсткімі мерамі здолеў прыпыніць працэсы дэмакратызацыі ў арміі, але пасля паразы Карнілаўскага мяцяжу настроі ў грамадстве ўвогуле і ў арміі ў прыватнасці набылі значна больш левы характар. Бальшавіцкая прапаганда, якая значна ўзмацнілася ў гэты час, спрыяла канчатковай дэмакратызацыі войскаў Заходняга фронту, якія ўжо не маглі пераш-

кодзіць усталяванню ў краіне ўлады бальшавікоў пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Такім чынам, дэмакратызацыя Заходняга фронту і арміі ўвогуле менш чым за год амаль цалкам разбурыла баяздольныя шматмільённыя ўзброеныя сілы краіны, паставіўшы пад пытанне далейшы ўдзел Расіі ў Першай сусветнай вайне.

**Літаратура**


1. *Белявина, В. Н.* Беларусь в годы Первой мировой войны / В.Н. Белявина. – Минск : Беларусь, 2013. – 396, [2] с. 1200 экз.
2. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]; Рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2006. – 613 с.; іл.
3. *Гончаров, В. Л.* 1917. Разложение армии : [сборник документов / автор-составитель В.Л. Гончаров]. – Москва : Вече, 2010. – 491, [3] с., [8] л. ил. – (Военные тайны XX века).
4. *Деникин, А. И.* Очерки русской смуты. [Электронны рэсурс].– Рэжым доступу: http://militera.lib.ru/memo/russian/denikin_ai2/1_06.html – Дата доступу: 23.03.2017.
5. *Латышонак, А.* Жаўнеры БНР / Алег Латышонак; [навуковы рэдактар А. Пашкевіч]. – Смаленск : Інбелкульт, 2014. – 373 с.
6. *Смольянинов, М. М.* Беларусь в Первой мировой войне, 1914–1918 гг. / М.М. Смольянинов; Национальная академия наук Беларуси, Институт истории. – Минск : Беларуская навука, 2014. – 317 с., [17] л. ил.
7. *Смольянинов, М. М.* Революционное сознание солдат Западного фронта в 1917 г. / М.М. Смольянинов; под редакцией И. М. Игнатенко; Академия наук Белорусской ССР, Институт истории. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 262, [2] с.


## ПЕРСАНАЛЬНЫЯ ДАНЫЯ Ў АРХІЎНЫХ ДАКУМЕНТАХ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ФОНДА 126 “НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ Я. КУПАЛЫ” БДАМЛМ)

**Дз. І. Варнашоў**

Кожны чалавек, калі атрымлівае медыцынскую дапамогу, уладкоўваецца на працу, выкарыстоўвае пошукавыя сістэмы ці сацыяльныя сеткі, пакідае пасля сябе пэўны аб’ём інфармацыі. З часам гэта інфармацыя назапашваецца, апрацоўваецца і трапляе ў архівы на пастаяннае ці часовае захоўванне, дзе можа быць выкарыстана ў розных накірунках. Рэспубліка Беларусь – адна з нешматлікіх краін, дзе адсутнічае галіновы закон аб ахове персанальных даных. Гэта прыводзіць да таго, што прыватныя асобы, дзяржава і бізнес бескантрольна збіраюць і выкарыстоўваюць персанальныя даныя, парушаючы падставовае права грамадзян на недатыкальнасць прыватнага жыцця.

У міжнароднай і замежнай юрыдычнай практыцы пад персанальнымі данымі разумеюць любую інфармацыю аб ідэнтыфікаванай або індэнтыфікуемай (дзякуючы гэтай інфармацыі) фізічнай асобе [1]. З масіва гэтай